# ПАЛІТАЛОГІЯ

*Вучэбны дапаможнік у 2-х частках*

*Частка 1*

32 c01
7-14

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка

# Паліталогія

Вучэбны дапаможнік у 2-х частках

Частка 1

Ф.К.

Президентская библиотека
Республики Беларусь
9"900000"00699

АБ

Прэзідэнцкая бібліятэка
1 332791
Рэспублікі Беларусь

Мінск, 1997

ББК 66я73
П 49

Друкуецца па рашэнні
рэдакцыйна-выдавецкага савета
ВДПУ імя М. Танка

*Аўтарскі калектыў:* В. А. Зенчанка, Э. Р. Іофэ, М. Б. Канапацкі, Г. А. Клішына, С. А. Навумава, Л. І. Новікаў, С. І. Сіманоўскі, Г. І. Сцяпанаў, Э. К. Цярпіцкі, Н. П. Шуміла

*Адказны рэдактар:* Г. І. Сцяпанаў

*Рэцэнзенты:* В. А. Бабкоў, доктар гістарычных навук, член-карэспандэнт АН Беларусі;
А. В. Макараў, прафесар, загадчык кафедры паліталогіі і сацыялогіі РІВШ БДУ

У першай частцы дапаможніка разглядаюцца найбольш важныя праблемы палітычнага жыцця грамадства, аналізуюцца асноўныя паняцці і катэгорыі сучаснай палітычнай навукі: палітычная ўлада, эліта ў палітыцы, палітычная дзейнасць, палітычнае лідэрства і інш. Значная ўвага надаецца характарыстыцы развіцця палітычнай думкі ў Расіі, Беларусі, краінах Захаду.

Прызначана студэнтам і выкладчыкам вышэйшых і сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў, настаўнікам і вучням сярэдніх агульнаадукацыйных школ, усім, хто цікавіцца праблемамі сучаснага палітычнага жыцця.

ISBN 985-436-037-1

© Калектыў аўтараў, 1997
© Арыгінал-макет: А. А. Пакала, 1997

# ЗМЕСТ

ПРАДМОВА (*Г. І. Сцяпанаў*) .......... 3

*Раздзел 1.* ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ПАЛІТАЛАГІЧНАЙ НАВУКІ .......... 5

1.1. Палітыка як сацыяльная з'ява і аб'ект вывучэння (*В. А. Зенчанка, Л. І. Новікаў, Э. К. Цярпіцкі*) .......... 5
1.2. Палітычная думка краін Захаду (*С. І. Сіманоўскі*) .......... 16
1.3. Гісторыя палітычнай думкі ў Расіі (*Н. П. Шуміла*) .......... 33
1.4. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця палітычнай думкі Беларусі (*Л. І. Новікаў*) .......... 59

*Раздзел 2.* ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ ГРАМАДСТВА .......... 78

2.1. Палітычныя адносіны (*Г. А. Клішына*) .......... 78
2.2. Палітычная ўлада (*Э. Р. Іофэ*) .......... 85
2.3. Эліта ў палітыцы (*С. А. Навумава, Г. І. Сцяпанаў*) .......... 98
2.4. Палітычная дзейнасць (*М. Б. Канапацкі*) .......... 111
2.5. Палітыка і асоба (*Л. І. Новікаў*) .......... 118
2.6. Палітычнае лідэрства (*В. А. Зенчанка*) .......... 128
2.7. Нацыі і нацыянальныя адносіны ў палітычным жыцці сучаснага грамадства (*В. А. Зенчанка*) .......... 138

# ПРАДМОВА

Як паказвае гістарычны вопыт, фарміраванне грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы, пераход да дэмакратыі і рынчных адносін, як і ажыццяўленне глыбокіх грамадскіх пераўтварэнняў у цэлым, немагчымы без якасных змен у свядомасці людзей, без авалодання асновамі дэмакратычнай палітычнай культуры.

Дапамагчы грамадству вырашыць гэту задачу і закліканы палітычная навука і палітычная адукацыя.

Пачынаючы з часоў Вялікай французскай рэвалюцыі 1789 г. у дзяржаў, што ступілі на шлях дэмакратычнага развіцця, узнікла рэальная патрэбнасць у палітычнай арыентацыі сваіх грамадзян, навучанні іх цывілізаваным нормам узаемаадносін на прынцыпах рацыянальнасці і гуманізму. Пад уплывам гэтых фактараў рэзка ўзрасла грамадская значнасць палітычных ведаў. Ужо ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя ў многіх краінах адбываецца канчатковае станаўленне палітычнай навукі як самастойнай, незалежнай акадэмічнай дысцыпліны, стварэнне спецыялізаваных інстытутаў і цэнтраў палітычнай адукацыі. Важным крокам у развіцці палітычных ведаў з'явілася рашэнне, прынятае Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА) у 1949 г., аб стварэнні Міжнароднай асацыяцыі палітычнай навукі.

Сёння палітычная адукацыя існуе ў любым дэмакратычным грамадстве. Палітычныя веды распаўсюджваюцца не толькі праз адукацыйныя ўстановы (школы, каледжы, універсітэты і г. д.), навуковыя цэнтры і сродкі масавай інфармацыі, але і праз субсідзіруемыя дзяржавай розныя фонды палітычнай асветы, якія фармальна дзейнічаюць пры многіх палітычных партыях, але фактычна не залежаць ад іх.

Палітычная адукацыя дае магчымасць грамадзянам правільна асэнсаваць існуючы грамадскі лад, усвядоміць сваё месца і ролю ў палітычным жыцці грамадства. Яе асноўная мэта — навучыць чалавека аналізаваць палітычныя працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, свабодна арыентавацца ў канкрэтных палітычных абставінах, прадстаўляць і абараняць свае інтарэсы, паважаючы пры гэтым думкі, інтарэсы і правы іншых людзей. Яна таксама накіравана на фарміраванне ў чалавека павагі да закону, дэмакратычнага парадку і дзяржаўных інстытутаў, якія забяспечваюць гэты парадак.

Асабліва вялікую ролю дэмакратычная палітычная адукацыя адыгрывае ў дзяржавах, якія ажыццяўляюць пераход ад таталітарызму да дэмакратыі. Не складае выключэння ў гэтых адносінах і Рэспубліка Беларусь.

Для яе, як і для іншых рэспублік былога СССР, характэрны нарастаючы плюралізм палітычнага жыцця, утварэнне новых партый і рухаў, барацьба паміж імі за масы і палітычную ўладу.

Вось чаму палітычныя веды і палітычная культура неабходны сёння кожнаму чалавеку, незалежна ад яго прафесійнай і сацыяльнай прыналежнасці. Ён павінен разбірацца ў правілах палітычнай барацьбы, валодаць мастацтвам кампрамісу і згоды, навучыцца спасцігаць заканамернасці палітычнага працэсу.

Дэідэалагізаваная, заснаваная на агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцях, палітычная адукацыя павінна дапамагаць чалавеку выпрацоўваць рацыяналістычны і дэмакратычны менталітэт, засвойваць каштоўнасці дэмакратычнай палітычнай культуры, фарміраваць такія якасці, як палітычная талерантнасць, гатоўнасць да кампрамісу і партнёрства, імкненне да цывілізаванага супрацоўніцтва з іншымі людзьмі, уменне ў рамках закону абараняць свае інтарэсы, адносна бязбольна, на аснове кансэнсусу вырашаць сацыяльныя канфлікты. Гэта будзе спрыяць умацаванню ў чалавека пачуцця грамадзянскага абавязку, адказнасці перад грамадствам і дзяржавай,ператварэнню яго з падданага ўладам у свядомага і паўнапраўнага грамадзяніна сваёй краіны.

Таму развіццё айчыннай палітычнай навукі, фарміраванне новай дэідэалагізаванай сістэмы дэмакратычнай палітычнай адукацыі на Беларусі, павінны стаць адным з прыярытэтных накірункаў у дзейнасці адукацыйных і навуковых устаноў, сродкаў масавай інфармацыі, навукова-педагагічнай грамадскасці.

Дадзены дапаможнік распрацаваны на аснове вучэбнай праграмы па курсу паліталогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Не прэтэндуючы на паўнату выкладання матэрыялу, бясспрэчнасць яго зместу і высноў, ён ставіць сваёй мэтай даць сістэматызаваныя веды пра палітыку як грамадскую з'яву, растлумачыць асноўныя тэарэтычныя паняцці і навучыць карыстацца імі для аналізу палітычных з'яў і працэсаў, сфарміраваць уяўленне пра асноўныя шляхі непасрэднага ўдзелу ў палітычным жыцці, выпрацаваць неабходныя для гэтага навыкі і ўменні.

Прапануемая кніга па паліталогіі арыентавана перш за ўсё на практычныя патрэбнасці вышэйшай і сярэдняй школы з мэтай далейшага паглыблення агульнагуманітарнай падрыхтоўкі студэнцкай і вучнёўскай моладзі, фарміравання ў яе сучаснай палітычнай культуры.

32.001
П-14

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка

# ПАЛІТАЛОГІЯ

*Вучэбны дапаможнік у 2-х частках*

*Частка 2*

Президентская библиотека
Республики Беларусь
9 998000 028043
Ф.Н.

Мінск, 1998

1 338097

ББК 66я73
П 49

Друкуецца па рашэнні
рэдакцыйна-выдавецкага савета
БДПУ імя М. Танка

*Аўтарскі калектыў:* М. А. Апімах, А. Е. Бенеш, Э. Г. Іофэ, Г. М. Каванцава, М. Б. Канапацкі, Г. А. Клішына, С. А. Навумава, Н. В. Паўлава, Г. І. Сцяпанаў, Л. М. Ракіцкая, Э. К. Цярпіцкі

*Адказны рэдактар:* Г. І. Сцяпанаў

*Рэцэнзенты:* В. А. Бабкоў, доктар гістарычных навук, член-карэспандэнт АН Беларусі;

А. В. Макараў, прафесар, загадчык кафедры паліталогіі і сацыялогіі РІВШ БДУ

У другой частцы дапаможніка разглядаецца структура і функцыянаванне палітычнай сістэмы грамадства. Асаблівая ўвага надаецца яе галоўным элементам, такім, як дзяржава, палітычны рэжым і інш.

Ахарактарызаваны знешнепалітычныя зносіны дзяржаў, паказана роля міжнародных арганізацый у сённяшнім жыцці. Падрабязна разглядаюцца асноўныя палітычныя дактрыны сучаснасці — лібералізм, кансерватызм, экстрэмізм і інш.

Выданне прызначана студэнтам і выкладчыкам вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, настаўнікам і вучням сярэдніх агульнаадукацыйных школ і ўсім, хто цікавіцца названымі праблемамі.

ISBN 985-435-038-X

© Калектыў аўтараў, 1998
© *Арыгінал-макет:* А. А. Пакала, 1999

# ЗМЕСТ

*Раздзел 3.* ПАЛІТЫЧНАЯ СІСТЭМА ГРАМАДСТВА .......................... 3

3.1. Палітычная сістэма: сутнасць, структура, тыпы (*Э. Р. Іофе*) . 3
3.2. Палітычны рэжым (*А. Е. Бенеш*) .......................... 15
3.3. Дзяржава як палітычны інстытут (*Н. В. Паўлава, Г. І. Сцяпанаў*) .......................... 26
3.4. Палітычныя партыі і партыйныя сістэмы (*А. Я. Бенеш, Н. В. Паўлава, Л. М. Ракіцкая*) .......................... 47
3.5. Грамадска-палітычныя рухі і арганізацыі ў палітычнай сістэме грамадства (*А. Я. Бенеш, Н. В. Паўлава, Л. М. Ракіцкая*) .......................... 61
3.6. Палітычная свядомасць і палітычная культура (*Н. В. Паўлава, Л. М. Ракіцкая*) .......................... 76
3.7. Дэмакратыя як спосаб арганізацыі палітычнай сістэмы (*С. А. Навумава*) .......................... 85

*Раздзел 4.* ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА СУСВЕТНАГА ПАЛІТЫЧНАГА ПРАЦЭСУ .......................... 104

4.1. Міжнародныя адносіны і знешняя палітыка дзяржаў (*Г. М. Каванцава*) .......................... 104
4.2. Асноўныя палітычныя дактрыны сучаснасці (*М. А. Апімах, М. Б. Канапацкі, Г. А. Клішына, А. Я. Бенеш, Н. В. Паўлава, Л. М. Ракіцкая*) .......................... 118

ЛІТАРАТУРА .......................... 155